# Змена клімату

## Парады пра тое, як скараціць свой вугляродны след

**Вугляродны след** – гэта сумарныя выкіды ўсіх парніковых газаў, якія пакідае чалавек, карыстаючыся энергетычнымі рэсурсамі або робячы пакупкі.

**$CO_2$ (вуглякіслы газ)** – асноўны парніковы газ, які ўплывае на змены клімату. Ён выдзяляецца ў атмасферу пры спальванні выкапнёвых відаў паліва: нафты, вугалю і прыроднага газу, якія выкарыстоўваюцца для атрымання энергіі. Значыць, зніжаючы штодзённыя выдаткі энергіі і рэсурсаў, можна скараціць выкіды CO2 і дапамагчы планеце. Як гэта можна зрабіць?

**Чытай парады  Читай советы – СКАРАЧАЙ! САЎДЗЕЛЬНІЧАЙ! ЗАХОЎВАЙ!**

# СКАРАЧАЙ! САЎДЗЕЛЬНІЧАЙ! ЗАХОЎВАЙ!

### ПА ДАРОЗЕ Ў ШКОЛУ, НА АДПАЧЫНАК І Ў ПАД'ЕЗДЗЕ

Часцей **хадзі пешшу** і карыстайся роварам.

Карыстайся **грамадскім** транспартам.

Пры паездцы ў іншы горад, калі ён не вельмі далёка, аддай перавагу **цягніку**, а не самалёту.

**СКАРАЧАЙ** свой вугляродны след!

### У ШКОЛЕ

**Павесь гэты плакат** у сваёй школе або ў пад'ездзе дома.

**Раскажы пра гэтыя парады** сябрам і знаёмым.

**САЎДЗЕЛЬНІЧАЙ** у барацьбе са зменай клімату!




### ПАРАДЫ НА КОЖНЫ ДЗЕНЬ

**Шчыльна закрывай** вадаправодны кран.

Стаўся **беражліва** да рэчаў, тады яны праслужаць даўжэй.

Радзей карыстайся прынтарам, **эканом паперу.**

**Сартыруй адыходы** для іх перапрацоўкі і другаснага выкарыстання.

Выкарыстоўвай рэчы, выраблены з другаснай сыравіны, або тыя, якія могуць прайсці **другасную перапрацоўку.**

**ЗАХОЎВАЙ** прыроду і рэсурсы!

### У КРАМЕ

Калі вы з бацькамі ідзяце ў краму:

- **бярыце сваю торбу** – радзей выкарыстоўвайце разавую ўпакоўку;
- купляйце бытавыя электрапрыборы з **нізкім** расходам энергіі;
- **купляйце мясцовыя прадукты харчавання**, на транспарціроўку якіх затрачана менш энергіі.

**СКАРАЧАЙ** свой вугляродны след!

**ЗАХОЎВАЙ!**

### ЭНЕРГАЗБЕРАЖЭННЕ Ў ДОМЕ

**Уцяпляй кватэру** або дом, каб узімку не выкарыстоўваць электраабагравальнікі.

**Выключай** за сабой святло.

Выкарыстоўвай **энергазберагальныя** лямпачкі.

**Выключай з разеткі** зарадныя прылады для мабільных прыбораў, калі яны не выкарыстоўваюцца.

**Не пакідай** камп'ютар, тэлевізар і іншыя электрапрыборы ў рэжыме чакання, выкарыстоўвай кнопкі ўкл/выкл або **адключай ад сеткі**.

Старайся **мыць** бялізну пры больш **нізкай тэмпературы 30-40 °С.**

**Падумай загадзя** пра тое, што хочаш узяць з халадзільніка, перш чым яго адкрыць.

Кіпяці столькі вады, колькі сапраўды **трэба.**

Пры гатаванні ежы **накрывай** рондаль або патэльню **вечкам**: так расходуецца ў 2,5 разы менш энергіі.

**СКАРАЧАЙ** свой вугляродны след!

КЛІМАТЫЧНАЯ ШКАТУЛКА.
РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ
UNDP